ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)
УДК 392.6
https://doi.org/10.29235/2524-2369-2019-64-3-279-288

Паступіў у рэдакцыю 27.03.2019
Received 27.03.2019

**Д. У. Сталяроў**

*Інстытут філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Беларусь*

# АСАБЛІВАСЦІ ПАТРЫЯРХАЛЬНАГА ГРАМАДСТВА І ІХ УПЛЫЎ НА СТАНОВІШЧА МУЖЧЫН

**Аннотация.** Рассматриваются особые черты гендерной системы патриархального общества и ее влияние на положение мужчин. В историческом контексте анализируются проявления традиционных маскулинных типов поведения. Проводится анализ женских и мужских ролей в социальном пространстве патриархата. Анализируются основные показатели социального состояния мужского и женского населения. В качестве примеров негативного влияния патриархата именно на мужчин приводятся наиболее распространенные риски для благосостояния мужчины в таком обществе. Описываются характерные психологические проблемы мужчин традиционных взглядов. Рассматриваются специфические влияния традиционных стереотипов на воспитательные и образовательные процессы. Предлагаются варианты реализации политики гендерного равенства в рамках существующих патриархальных культур. Обосновывается необходимость преодоления некоторых патриархальных стереотипов.

**Ключевые слова:** патриархат, дискриминация, гендер, равенство, девиация, власть, ценности, традиции

**Для цитирования.** Сталяроў, Д. У. Асаблівасці патрыярхальнага грамадства і іх уплыў на становішча мужчын / Д. У. Сталяроў // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2019. – Т. 64, № 3. – С. 279–288. https://doi.org/10.29235/2524-2369-2019-64-3-279-288

**D. U. Staliarou**

*Institute of Philosophy of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus*

## PARTICULARITIES OF PATRIARCHAL SOCIETY AND ITS INFLUENCE OVER MEN'S POSITION IN SOCIETY

**Abstract.** The article examines the characteristics of a patriarchal society. Traditional masculine behavior is analyzed. Male and female roles in patriarchal culture are explored. Psychological problems of men in traditional society are investigated. Specific influence of traditional stereotypes on social institutions of education is analyzed. The necessity of implementing the policy of gender equality and overcoming patriarchal stereotypes in traditional societies is explained.

**Keywords:** patriarchy, discrimination, gender, equality, deviation, power, values, traditions

**For citation.** Staliarou D. U. Particularities of patriarchal society and its influence over men's position in society. *Vestsi Natsyyanal'nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series*, 2019, vol. 64, no. 3, pp. 279–288 (in Belarusian). https://doi.org/10.29235/2524-2369-2019-64-3-279-288

**Уводзіны.** Існуе два крайнія ўвасабленні маскуліннасці – гегемонная і натуральная. Гегемонная маскуліннасць мае на ўвазе стыль жыцця, які адпавядае мужчынскаму хабітусу лідарства, улады, першынства. Гэта выяўляецца таксама ва ўключэнні ў мову і фіксацыю ў ёй гендарных стэрэатыпаў. Натуральная маскуліннасць ўвасабляе сабой жыццё, адпавядаючае мужчынскаму хабітусу, які прадугледжвае зняцце розных абмежаванняў, уласцівых для гегемоннай маскуліннасці. Пад гэтым разумеецца і права на эмацыянальныя выяўленні, і прызнанне за мужчынам права на няўпэўненасць у розных сітуацыях, турботы за будучыню, варыянты выбару іншых, адрозных ад традыцыйных, стасункаў з дзецьмі і іншымі сваякамі ў сям'і [1, с. 2].

У цяперашні час актыўнай глабалізацыі становіцца зразумела, што многае з таго, што прынята лічыць мужчынскімі паводзінамі ў рамках адной якой-небудзь культуры, не з'яўляецца нейкім універсальным крытэрыем. Схіляючыся ў бок глабалізацыйнага грамадства, мы ўсё больш ясна разумеем, што ўяўленні аб маскуліннасці могуць сур'ёзна адрознівацца ў розных культурах і грамадствах [2, с. 30].

© Сталяроў Д. У., 2019

І. Кант разважаў аб гендарных пытаннях у класічным патрыярхальным кантэксце, але менавіта яго навуковыя пошукі выклікаюць асаблівую цікавасць пры разглядзе патрыярхату як сістэмы дыскрымінацыі мужчын. Так, Кант сцвярджаў: «Дабрачыннасць жанчыны ёсць прыгожая дабрачыннасць. Дабрачыннасць мужчынскага полу ёсць дабрачыннасць высакародная. Жанчыны пазбягаюць благога не таму, што яно несправядлівае, а таму, што яно непрыгожае, і дабрачыннымі будуць для іх учынкі ў першую чаргу прыгожыя. Ніякага "павінна", ніякага "трэба", ніякіх абавязкаў, ніякіх загадаў, ніякага прымусу жанчына трываць не будзе. Яна робіць нешта толькі таму, што так ёй падабаецца; таму галоўнае – умець зрабіць так, каб ёй падабалася толькі тое, што добра» [3, с. 155].

Такім чынам, бачна, як сур'ёзна падзяляюцца Кантам мужчынскія і жаночыя гендарныя ролі, як улада і сіла, якая даецца мужчыну пры патрыярхаце, цалкам перакладае на яго ўсю працу і адказнасць у дачыненні да ключавых сацыяльных функцый. Кант намякае, што прымус і абавязак – доля мужчыны, жанчына ж нічога падобнага не прыме. Зноў жа мужчына ў патрыярхаце павінен падумаць, як накіраваць жанчыну на патрэбны шлях. На прыкладзе гэтага можна назіраць, як залежны і нагружаны вялікімі абавязкамі мужчына ў патрыярхальным грамадстве спрабуе схаваць і рацыяналізаваць сваё прыгнечанае становішча за кошт прыпісвання сабе выдатных асобасных якасцей, якія нібыта недаступны жанчыне.

У дадзенай сітуацыі страх неадпаведнасці сацыяльным чаканням і наступленне за гэтым санкцый прымушаюць шматлікіх мужчын да ненатуральных для сябе паводзін і дзеянняў, што ў далейшым прыводзіць да істотнага пагаршэння іх псіхалагічнага і фізічнага стану. Апісаныя абставіны істотна ўскладняюць развіццё не толькі гендарных даследаванняў, але і наогул усіх даследаванняў, звязаных з мужчынамі, таму што патрыярхальныя стэрэатыпы загадваюць мужчыне перш за ўсё ўласную дзейсную актыўнасць як асноўны крытэрый мужнасці і паспяховасці, а прамы або ўскосны ўдзел у даследаванні робіць з такога мужчыны суб'екта, што ў патрыярхальным грамадстве асуджаецца. Прычына гэтага ў тым, што культура патрыярхату навязвае каштоўнасці, цэнтральным ідэалам якіх з'яўляецца не проста паспяховы, а абсалютна беспраблемны мужчына. Гэта тычыцца не толькі кар'ернага росту і матэрыяльнага стану, але і сфер псіхічнага і фізічнага здароўя. Вось чаму ў такіх грамадствах не адлюстроўваюцца не толькі псіхалагічныя, а нават і праблемы фізічнага здароўя мужчын, што ў далейшым негатыўна адбіваецца як на фінансавым забеспячэнні мужчынскіх адукацыйных праграм, прысвечаных псіхічнаму здароўю і прадукцыйнай сацыялізацыі, так і на забеспячэнні праграм па ахове фізічнага здароўя мужчын.

**Асноўная частка.** У сферы тэарэтычных распрацовак праблемы маскуліннасці паступова былі вызначаны дзве фундаментальныя яе часткі: фалацэнтрызм як увасабленне сілы, сутнасць якой – валодаць, адымаць, пакараць, і логацэнтрызм – сістэма ўяўленняў аб розуме як універсальнай прыкмеце мужчыны. Асноўная праблема гегемоннай маскуліннасці ў немагчымасці ўзаемадзеяння і ўзаемаіснавання дзвюх гэтых сіл і іх супярэчнасць. Такое становішча робіць канон гегемоннай маскуліннасці немагчымым або індывідуальна-экзатычным. Падобная складанасць стварае ўмовы для перагляду ролі і функцый мужчыны ў грамадстве і стварэння альтэрнатыўных вобразаў [4, с. 356].

На сённяшні дзень можна адзначыць, што вялікая распаўсюджанасць сярод мужчынскага насельніцтва наркаманіі, злачыннасці, курэння, п'янства, самагубстваў – гэта следства праявы своеасаблівай дыскрымінацыі, паколькі менавіта пад ціскам маскулінных стэрэатыпаў многія мужчыны робяцца ахвярамі пералічаных дэвіяцый. Гэта пацвярджаецца і ў даследаванні карэляцыі паміж алкагалізмам і суіцыдамі пад назвай «Спажыванне алкаголю і суіцыды ў Беларусі і Расіі: параўнальны аналіз трэндаў», у рамках якога вывучаўся перыяд з 1980 па 2005 г. Зыходзячы з ацэнкі выкарыстання мадэлі аўтарэгрэсіі, можна зрабіць выснову, што з павелічэннем ужывання алкаголю на літр у Беларусі рос і ўзровень суіцыдаў на 6,6%. У дадзенай сітуацыі асабліва цікавы перыяд 1990-х гг. Менавіта тады сацыяльна-эканамічныя аспекты жыцця найбольш абвастрыліся, роўна як і абвастрыліся сацыяльныя стэрэатыпы мужнасці/жаноцкасці. Істотнае ўзрастанне самагубстваў тлумачылася сумяшчэннем алкагольнага ўздзеяння і фактару псіхасацыяльнага дыстрэсу, якія ўзаемна ўзмацнялі адзін аднаго. Сацыяльна-эканамічны крызіс

стымуляваў узнікненне і распаўсюджванне аноміі і псіхасацыяльнага дыстрэсу, што і выклікала рэзкае павелічэнне алкагалізацыі насельніцтва. Натуральна, з прычыны вялікіх псіхафізічных нагрузак менавіта на мужчын гэтыя з'явы распаўсюдзіліся ў большай ступені. Так, у Беларусі на працягу перыяду з 1980 па 2005 г. узровень самагубстваў сярод мужчын павысіўся на 30,9% (з 42,7 да 55,9 на 100 тыс. насельніцтва). Сярод жанчын лічба больш сціплая, ды і разбежка паміж паказчыкамі таксама не асабліва істотная. Колькасць суіцыдаў сярод жанчын вырасла на 7,2% (з 8,3 да 8,9 на 100 тыс. насельніцтва). Варта адзначыць, што менавіта ў перыяд пачатку 1990-х гг. (з 1991 па 1994 г.) узровень суіцыдаў сярод мужчын у Беларусі ўзрос на 47%. У сувязі з гэтым можна адзначыць і большы ціск на псіхіку мужчыны менавіта знешніх, неспрыяльных і пераломных сацыяльных фактараў, што абумоўлена дзеяннем у грамадстве класічных патрыярхальна-кансэрватыўных стэрэатыпаў маскуліннасці [5, с. 38, 41].

У Расіі склалася падобная сітуацыя, калі ў перыяд з 1998 па 2001 г. адбыўся рэзкі рост мужчынскіх самагубстваў, якія, як тлумачаць аўтары названага сацыялагічнага даследавання, быў справакаваны такім сацыяльным узрушэннем, як банкаўскі крызіс 1998 г. [5, с. 42].

Ажыццяўляючы праверку ўплыву эканамічных фактараў у Германіі, таксама вывучалі ўзаемасувязі чатырох эканамічных састаўляючых з узроўнем самагубстваў на працягу 1881–1989 гг. Найбольш моцная карэляцыя выяўлялася на этапах сацыяльнай дэзынтэграцыі, калі існавалі высокае беспрацоўе, высокая рызыка банкруцтва і нізкая падтрымка дзяржавы [6, с. 203].

У процівагу феміністскім тэорыям пра мацнейшыя пакуты жаночага несельніцтва ад дэпрэсіўных хваляванняў можна таксама адзначыць, што, паводле нядаўніх даследаванняў, якія праводзіліся сярод дзяцей і падлеткаў, ад дэпрэсіі пакутуе прыкладна роўная колькасць хлопчыкаў і дзяўчынак. Праблема толькі ў тым, што з-за агрэсіўнага навязвання патрыярхальных стэрэатыпаў, хлопчыкі вымушаны хаваць знешнія праявы сваіх сапраўдных пачуццяў. Людзі з прычыны гэтага у большасці сваёй нават не дапускаюць думкі пра дэпрэсіўныя пачуцці і звяртаюцца да няправільных метадаў выяўлення псіхалагічнага стану такога чалавека [7, с. 56, 57]. Ва ўзросце ж ад 8 да 12 гадоў у хлопчыкаў, наогул, дэпрэсія выяўляецца часцей і працякае больш цяжка, чым у дзяўчынак [7, с. 59].

На сучасным этапе ў ЗША кожны год 600000 амерыканцаў паміраюць ад хвароб сэрца. З іх амаль 60% складаюць мужчыны. Адны даследчыкі адзначалі чыста фізіялагічныя прычыны, іншыя, напрыклад лекары М. Фрыдмен і Р. Розэнмэн, прытрымліваліся думкі пра тое, што да падобных трагедый прыводзяць пэўныя ўзоры паводзін. Яны сцвярджалі, што для людзей, схільных да сардэчна-сасудзістых захворванняў, уласцівы паводзіны, якія ўключаюць ў сябе тыповыя рысы патрыярхальнай маскуліннасці. Яны заключаюцца ў вялікіх амбіцыях, энергічнасці, апантанасці, жаданні атрымаць поспех, імкненні максімальна хутка дасягнуць яго. Такія людзі часта бываюць агрэсіўныя і нядобразычлівыя, а поспехі іншых ацэньваюць хутчэй з колькаснага пункта гледжання, чым з якаснага. Асаблівасці такіх паводзін фарміруюць фізічныя фактары, якія прыводзяць да захворванняў сэрца. Такі тып паводзін больш уласцівы мужчынам, што абумоўліваецца living рознымі культурнымі ўяўленнямі аб паводзінах мужчын і жанчын [8, с. 328]. Сугучныя гэтаму і ідэі навукоўца У. Фарэла, які назваў мужчынскую ўладу «міфам», паколькі мужчыны і жанчыны маюць узаемадапаўняльныя ролі і аднолькава дыскрэдытуючыя стэрэатыпы «сексуальнага аб'екта» і «пасляховага аб'екта» [9, с. 156].

Падобную сітуацыю можна прасачыць і ў лацінаамерыканскіх краінах. У дадзеным рэгіёне мужчынскае насельніцтва адчувае на сабе істотны ціск, што вымушае іх прытрымлівацца ладу традыцыйнай маскуліннасці ва ўсіх жыццёвых сферах. Ідэнтычнасць мужчыны ў гэтай культуры пабудавана на супрацьпастаўленні сябе жанчыне. Гэта абавязвае мужчыну якім-небудзь чынам самасцвердзіцца, каб выглядаць «мужчынам» у вачах грамадства. Усхваляемая ў лацінаамерыканскім грамадстве маскуліннасць звязана з традыцыйнымі паняццямі пра сексуальныя подзвігі, гатоўнасць сустрэцца з небяспекай твар у твар, бравадай. Нормы мясцовай маскуліннасці дыктуюць тое, што мужчына не павінен адмаўляцца ад спакус і нават у гэтым выпадку дэманстраваць стабільна высокі ўзровень. Гэта прыводзіць да празмернага ўжывання алкаголю, тытуню, наркотыкаў, а таксама да пераядання і дэвіянтных сексуальных паводзін. Праявы жорсткасці апраўдваюцца, што істотна ўплывае на ўзровень злачыннасці ў Лацінскай Амерыцы [2, с. 28].

Шмат у чым такому становішчу паспрыялі і сацыябіялагічныя тэорыі, якія, па меркаванні амерыканскага псіхолага С. Бэм, стэрэатыпна характарызуюць асоб мужчынскага полу як «схільных да сексуальнага праміскуітэту, гвалту, пакідання партнёрак і нашчадкаў, агрэсіі супраць іншых самцоў, непрымання нявернасці самак, аддалення ад асоб жаночага полу, забойства някроўных дзяцей і ўніверсальнага мужчынскага дамінавання. Асобам жаночага полу яны прыпісваюць сціпласць, ухіленне ад сексу, асцярожны выбар сексуальных партнёраў, прысвячэнне часу і энергіі бацькоўскім клопатам і падман мужчын па пытаннях бацькоўства» [10, с. 53].

Душэўныя пакуты, звязаныя з няпісаным абавязкам адпавядаць дамінуючым стэрэатыпам маскуліннасці, выклікаюць шмат негатыўных эфектаў. У якасці прыкладу можна прывесці старажытнагрэчаскую цывілізацыю, у якой так выразна рабіўся акцэнт на традыцыйнай мужчынскасці. У свеце старажытных элінаў мужчынскі ўзор быў эталонам. Усё прадумвалася і стваралася па яго прыкладу і прынцыпах. Тым не менш пануючы статус ніяк не ўплываў на збаўленне мужчын таго часу ад боязі і сумненняў у сваёй адпаведнасці маскулінным эталонам. Бескампраміснае саперніцтва, асабліва моцнае ў грэчаскім грамадстве таго часу, распаўсюджвалася і на знешні выгляд мужчын. Вельмі значнымі былі не толькі фізічная сіла і службовыя амбіцыі, але і прыгожая знешнасць, галоўнымі знатакамі якой былі зусім не жанчыны, а зноў жа мужчыны. Не дзіўна, што неадэкватна ўзмоцнены канон патрыярхальнай маскуліннасці і пакланенне перад ёй суправаджаліся распаўсюджваннем гомасексуалізму [11, с. 101].

Цікавасць культуры старажытнагрэчаскага грамадства менавіта да аголенага мужчынскага цела тлумачылася спалучэннем шэрага фактараў. Двума асноўнымі з іх можна лічыць: 1) патрыярхальную ўладу і жорсткую дыферэнцыяцыю мужчынскага і жаночага; 2) трансфармацыю закрытых мужчынскіх ініцыяцый у грамадскія мерапрыемствы спаборніцкага характару ў аголеным выглядзе. У сувязі з гэтым сфарміраваўся культ спартыўных дасягненняў і лаяльнае стаўленне культуры да гомаэратызму. [11, с. 156].

У Старажытным Рыме таксама пераважала маскуліннасць такога характару. Яна непазбежна выклікала ў мужчынскім грамадстве гомасексуальныя практыкі. Гэта выяўлялася і ў мастацтве. Напрыклад, адным з самых папулярных старажытнарымскіх адлюстраванняў аголенага цела былі шматлікія скульптуры любімца імператара Адрыяна прыгажуна Антыноя, які стаў адным з сімвалаў аднаполага кахання [11, с. 152]. Існавалі ў старажытнарымскі час нават пэўныя практыкі дыскрымінацыі мужчын, замацаваныя юрыдычна. Да прыкладу, мужчыну ставілі ў абавязак вяртаць даўгі сваёй жонкі, жанчына ж не павінна была аплачваць запазычанасці мужа [12, с. 341].

Маральныя паняцці аб мужчынскім і жаночым гонары ў патрыярхальнай культуры таксама вельмі розныя. Мужчынскі гонар заўсёды звязваўся з канкурэнцыяй, перавагай над іншымі, жаночы – з мірам і чысцінёй. Грамадства навязвае мужчыне думку пра тое, што ён не з'яўляецца першапачатковай самакаштоўнасцю, а абавязаны заслужыць права на павагу і прызнанне свайго гонару. Менавіта падобныя маскулінныя ўстаноўкі дазвалялі на працягу шматлікіх гадоў існавання патрыярхальнай сістэмы маніпуляваць паводзінамі і ўчынкамі мужчын [13, с. 188].

Ж.-Ж. Русо апісваў дадзены працэс наступным чынам: «Жанчына, слабая і не знаёмая са знешнім светам, узважвае і судзіць, якія рухавікі можа пусціць у ход для папаўнення сваёй слабасці, і гэтымі рухавікамі аказваюцца эмацыянальныя жаданні мужчыны. У яе механізм мацней нашага; усе рычагі яго здольныя рухаць чалавечае сэрца. Яна павінна валодаць мастацтвам прымушаць нас рабіць усё тое, чаго жаночы пол не можа зрабіць сам, але што неабходна яму ці прыемна» [14, с. 357]. Нягледзячы на прызнанне філосафам строгай гендарнай дыферэнцыяцыі і рознага прызначэння мужчын і жанчын, больш правільна будзе казаць не пра папаўненне слабасці, а пра яе выкарыстанне. Некаторая частка жанчын адаптавала сваю слабую пазіцыю для найбольш рацыянальнага і спрыяльнага жыцця ва ўмовах патрыярхату.

Вельмі цікава ў плане гендарнага падзелу роляў разгледзець прэстыжнасць і статус такога тыпу заняткаў, як бізнес. Дыскурсіўныя тэхналогіі, якія фарміруюць маскуліннасць у сферы бізнесу, мадэлявалі ролі дзелавога і недзелавога плана, інтарэсы, жаданні і нават знешнасць. Часовая і прасторавая актыўнасць статуснага мужчыны таксама была жорстка рэгламентавана [15, с. 246].

Мужчынская сутнасць прадпрымальніцтва моцна адбівалася на ідэалах купецтва, якія складаліся ў той час, і на штодзённых паводзінах купцоў у прыватнасці. Імкненне адпавядаць вобразу,

згодна з якім купец – гаспадар жыцця, падштурхоўвала многіх гандляроў на разгульнае жыццё, якое ўключала ў сябе рознага роду празмернасці. Ужо ў XVII – XIX стст. удалыя здзелкі было прынята не толькі багата адзначаць у піцейных установах, але і працягваць дадзеныя мерапрыемствы ў публічных дамах. Так, эканамічны поспех мужчыны цесна звязваўся ў грамадскай свядомасці з вялікімі сексуальнымі і спажывецкімі магчымасцямі [16, с. 398].

У розныя гістарычныя перыяды мужнасць падвяргалася трансфармацыі. Чым больш развітым было патрыярхальнае грамадства, тым больш жорсткім быў канцэпт ідэалу мужнасці. Калі ў XVIII ст. мужчына, якога лічылі годным дадзенага наймення, яшчэ мог дазволіць сабе плакаць у чыёй-небудзь прысутнасці ці паскардзіцца на дрэннае самаадчуванне, то ў XIX ст. гэта ўжо магло каштаваць яму рэпутацыі сапраўднага мужчыны. У далейшым ідэалы мужнасці таксама змяняліся, як у больш строгі, так і ў больш ліберальны бок. З гэтага можна зрабіць вывад, што пабудаванае аднойчы можна як разбурыць, так і аднавіць [17, с. 55].

Другая палова XIX – пачатак XX ст. характарызаваліся для ўсходнеславянскіх зямель змякчэннем аўтарытарнасці ў гендарнай сферы. Гендарны парадак змяняўся пад уплывам грамадскіх змен. Улада мужчын паступова памяншалася, а сацыялізацыя хлопчыкаў і дзяўчынак станавілася ўсё менш кантраснай. Нягледзячы на гэта, патрыярхальна-аўтарытарная аснова гендарных адносін зменена не была [16, с. 398].

Сур'ёзныя праблемы з-за жорсткай гендарнай дыферэнцыяцыі грамадства ўзнікаюць і ў ісламскім свеце. Гэта выяўляецца ў павелічэнні колькасці згвалтаванняў і распаўсюджванні гомасексуалізму, нягледзячы на строгія законы шарыяту, якія ў асобных краінах нават прадугледжваюць за гэта смяротнае пакаранне. З-за ўскладненых адносін з жанчынамі, якія часта патрабуюць ад мужчын непасільнай адпаведнасці маскулінным стэрэатыпам, такія адносіны даступны толькі невялікай колькасці мужчынскага насельніцтва. Пад уздзеяннем стэрэатыпаў маскулінасці мужчыны ідуць супраць сваёй прыроды, тым самым пагаршаючы сацыяльны клімат і непрадукцыйна арганізоўваючы жыццё. Напрыклад, па даных Камісіі па правах чалавека, у Пакістане згвалтаванне здзяйсняецца раз у дзве гадзіны, а кожныя восем гадзін – групавое згвалтаванне [18, с. 148].

Наконт сексуальнага гвалту ў дачыненні да хлопчыкаў і мужчын даследаванні, праведзеныя ў развітых краінах, паказваюць, што 5–10% мужчын падвяргаліся яму. У некаторых нацыянальных даследаваннях, праведзеных па дадзенай тэме, фігуруюць такія лічбы, як 3,6% – у Намібіі, 13,4% – у Аб'яднанай Рэспубліцы Танзанія, 20% – у Перу. У цэлым, статыстыкі, якая б карэктна паказвала ўзровень гвалту над мужчынамі і падлеткамі, вельмі мала, што істотна ўскладняе вывучэнне дадзенай праблемы. Большасць экспертаў мяркуюць, што прыведзеныя лічбы істотна прымяншаюць сапраўдную колькасць мужчын-ахвяр згвалтаванняў. Распаўсюджаны сведчанні, што мужчыны значна радзей жанчын звяртаюцца з падобнымі праблемамі ў паліцыю або да лекараў. Гэтаму спрыяе цэлы шэраг прычын: сорам, пачуццё віны, страх, што ім не павераць ці асудзяць за тое, што адбылося. Моцныя міфы вакол мужчынскай сексуальнасці ў патрыярхальным грамадстве перашкаджаюць ахвярам-мужчынам зрабіць заяву аб згвалтаванні [6, с. 162–163].

Важнай праблемай на сённяшні дзень з'яўляецца і ахова здароўя, дзе назіраецца нераўназначнае стаўленне да мужчын і жанчын. Паводле даных шматлікіх даследаванняў, практычна ва ўсіх краінах працягласць мужчынскага жыцця значна менш, чым жаночага. Нягледзячы на гэты відавочны факт, многія сусветныя арганізацыі аховы здароўя па-ранейшаму надаюць у сваіх справаздачах значна больш увагі менавіта жаночаму здароўю і вырашэнню праблем жанчын. Нават раздзелы іх дакументаў, прысвечаныя гендарнай роўнасці, заўсёды вытрыманы ў кантэксце пашырэння жаночых правоў. Прыкладам таму можа служыць справаздача Сусветнай Арганізацыі Аховы здароўя, у раздзеле якой аб гендарнай роўнасці адзначаецца: «Рознае стаўленне да мужчынскага і жаночага полу, якое выяўляецца ў паўнамоцтвах, рэсурсах, правах, нормах, а таксама ў спосабе структуравання арганізацый і ажыццяўлення праграм, наносіць шкоду здароўю мільёнаў дзяўчынак і жанчын». Падобны падыход відавочна супярэчыць фактам пра смяротнасць і рызыку захворвання і траўмаў сярод мужчынскага насельніцтва. Можна меркаваць, што такое абыякавае стаўленне да мужчынскага здароўя нават з боку арганізацый сусветнага ўзроўню сведчыць пра каласальны негатыўны ўплыў патрыярхальных стэрэатыпаў на жыццё мужчын

і іх успрыманне грамадствам, паколькі менавіта ў культуры маскуліннасці патрыярхату сфарміраваўся вобраз нязломнага мужчыны, непадуладнага ні псіхалагічным праблемам, ні пачуццёваму стану, ні фізічным хваробам [18, с. 16].

Аднабаковае маскуліннае ўспрыманне сябе і свету вакол фарміруе адпаведнае стаўленне да здароўя. У даследаванні Р. А. Беразоўскай (2001), якая вывучала менеджараў, было выяўлена, што ў жанчын каштоўнасць здароўя істотна вышэй у параўнанні з мужчынамі. Гэта стала відавочным зыходзячы з таго, што значнай ролю здароўя для актыўнага і паспяховага ладу жыцця палічылі 24% жанчын і толькі 15% мужчын. З пазіцыяй аб тым, што добрае здароўе – важны фактар паспяховай прафесійнай дзейнасці, пагадзіліся 27% жанчын і 12% мужчын [19, с. 56].

У плане захворванняў у свеце значны перакос у бок мужчынскага насельніцтва. Ад хвароб печані памірае ўдвая большая колькасць мужчын, чым жанчын, ад СНІДу мужчынская смяротнасць адбываецца ў 10 разоў часцей. Рознага роду грыжы – праблемы са здароўем, звязаныя пераважна з падняццем цяжару – таксама ў большасці выпадкаў сустракаюцца менавіта ў мужчын [19, с. 62].

Нераўназначнае стаўленне ў большасці культур свету назіраецца і да дзяцей рознага полу. Хлопчыкі, як правіла, падвяргаюцца большай рызыцы грубых фізічных пакаранняў, чым дзяўчынкі. Гэта тлумачыцца дзеяннем традыцыйных патрыярхальных установак, якія разглядаюць падобныя пакаранні як падрыхтоўку да будучай ролі дарослага мужчыны, які абавязаны пераажываць і пераадольваць цяжкасці, якія могуць быць звязаны і з фізічным гвалтам [6, с. 70].

Такі падыход да выхавання знаходзіць сваё негатыўнае адлюстраванне і ў ходзе далейшай сацыялізацыі хлопчыка. Па статыстыцы для хлопчыка значна вышэй рызыка стаць ахвярай або віноўнікам забойства. Забойства стабільна займае месца ў пяцёрцы найбольш распаўсюджаных прычын смерці сярод падлеткаў, 80% з якіх – хлопчыкі і юнакі. На кожны выпадак забойства прыпадаюць мноства выпадкаў цялесных пашкоджанняў, у тым ліку і такія, якія прыводзяць да інваліднасці. Акрамя таго, для хлопчыкаў і юнакоў значна вышэй, чым для дзяўчынак і дзяўчат, верагоднасць стаць удзельнікам бойкі або ахвярай нападу [20, с. 18].

На сённяшні дзень існуе мала навуковых даследаванняў, якія вывучаюць абмежаванні, што стварае традыцыйная мужчынская роля. Традыцыйныя рысы такой ролі, якія сістэматычна крытыкаваліся жанчынамі, якія праяўляюцца ў мінімуме эмоцый і недастатковым ўдзеле у жыцці сям'і, заахвоцілі даследчыкаў дэталёва і глыбей разгледзець праблемы, звязаныя з гэтай роляй. Вывучаючы мужчынскія і жаночыя ролі, навукоўцы выпрацавалі больш крытычнае мысленне ў дачыненні да іх з прычыны ўзаемазвязанасці гэтых роляў. Адной з пазіцый, сфармуляваных у ходзе навуковага аналізу, стала тое, што гвалт часам мае ўзаемаабумоўлены характар, а прычыны агрэсіўных паводзін мужчын заключаюцца ў традыцыйных уяўленнях аб мужнасці [21, с. 88].

Стыль паводзін многіх мужчын часта грунтуецца на іх уяўленнях аб мужнасці, якія былі сфарміраваны культурай. Усё гэта з'яўляецца наборам грамадскіх нормаў, якія і называюцца мужчынскай гендарнай роляй. У апошні час навукоўцы развіваюць ідэю, маючую на ўвазе функцыянаванне ў грамадствах не адзінай формы мужнасці, а многіх формаў. Такі падыход патрабуе прызнання ўплыву на фарміраванне якасцей мужчыны не толькі полу, але і іншых фактараў, а таксама асобасных характарыстык [21, с. 89].

Згодна з даследаваннямі шэрага арганізацый, можна адзначыць, што адбываюцца пэўныя змены ў разуменні мужнасці. Такія працэсы прасочваюцца ўжо дастаткова даўно ў некаторых краінах. Мужчыны пачынаюць паступова аддаваць перавагу новым гендарным каштоўнасцям, а не канцэпцыям традыцыйнага патрыярхату, тым самым адкрываючы ў сабе новыя грані і спрыяючы развіццю гендарнай роўнасці. Да прыкладу, паводле даследавання Цэнтра грамадскай палітыкі Рэдкліф, здзейсненага яшчэ ў 2000 г., 82% амерыканскіх мужчын ва ўзросце 20–39 гадоў прытрымліваліся думкі, што рэжым працоўнага дня, які дазволіць больш часу прысвячаць сям'і, важней за грошы. 71% мужчын гатовыя страціць у даходзе дзеля таго, каб больш часу прысвяціць сям'і. У Сінгапуры 61% адзінокіх мужчын заявілі, што нармальна ставяцца да сітуацыі, калі жонка зарабляе грошы, а муж займаецца хатнімі справамі [2, с. 58].

Зараз сфера асабістых адносін паміж людзьмі шмат у чым знаходзіцца пад уплывам выключна эканамічных інтарэсаў з боку жанчын. Працэсы асабістых адносін трымаюцца пераважна на

грошах, прычым укладваць іх, згодна з прынцыпамі патрыярхальнага грамадства, павінен толькі мужчына, каб даказаць сваю мужнасць. Гэтая норма выклікае мноства праблем для мужчын. Можна адзначыць, што многія мужчыны проста не ў стане цалкам ёй адпавядаць, з гэтай прычыны іх самаацэнка заніжаецца. Патрыярхальнае разуменне мужнасці засноўваецца на базе матэрыяльных каштоўнасцей і сацыяльнага статусу. Праблема заключаецца ў тым, што вельмі малая колькасць мужчын дамагаецца такога высокага становішча, калі яны адчуваюць сябе ўпэўненымі, бо ў гэты час іншыя мужчыны дамагаюцца большага, чым прымушаюць больш нізкіх па статусе адчуваць сябе на слабай пазіцыі. Празмерная значнасць матэрыяльнай забяспечанасці ў мужчыны ў вачах традыцыйнага грамадства аказвае негатыўнае ўздзеянне на развіццё і прымяненне яго асабістых унікальных здольнасцей, якія могуць не адпавядаць каштоўнасным арыенцірам патрыярхату і культуры спажывання. Гэта выяўляецца больш канкрэтна ў прыкладах, калі мужчына пад ціскам стэрэатыпаў і/або нерацыянальна арганізаванай эканомікі вымушаны выбіраць не тую сферу дзейнасці, да якой больш здольны і якая больш падабаецца, а тую, дзе больш плацяць [21, с. 91].

Паралельна жыццё мужчыны актыўна абясцэньваецца ў СМІ. Гэта выяўляецца ў трансляцыях пераважна смерці мужчын у кінафільмах, ідэалізацыі самаахвярнасці сярод мужчын. З часам стала зразумела, што ідэал патрыярхальнай мужнасці проста небяспечны для жыцця, здароўя і не абяцае мужчыне нічога, акрамя страт, дэпрэсіі і адзіноты [17, с. 230].

Крызіс традыцыйнай маскуліннасці быў адзначаны яшчэ ў савецкім грамадстве. Гэтае праблемнае пытанне ўзнімалася ў 1970 г. дэмографам Б. Ц. Урланісам. У 1980-х гг. дадзеная тэма развівалася, і даследчыкі сфармулявалі шэраг паказчыкаў крызісу маскуліннасці. Гэта і малая працягласць жыцця, і самадэструктыўныя паводзіны, і няшчасныя выпадкі, і рост захворванняў. У рамках дадзенага дыскурсу мужчыны – ахвяры, якіх ніяк нельга назваць актыўнымі і самастойна дзеючымі агентамі [22, с. 433].

Падобныя высновы прывялі да неабходнасці распрацоўкі метадаў для пераадолення сітуацыі, якая склалася. Дзяржаўныя стратэгіі ў дадзенай галіне прапаноўвалі стварэнне аздараўленчых цэнтраў для мужчын. Адной з мер, якія практыкаваліся ў 1970-х гг. у рамках вырашэння пытання аб мужчынскім здароўі, стала ўсталяванне сеткі наркалагічных дыспансераў. Шэраг даследчыкаў прапаноўвалі зрабіць яшчэ больш – усіх мужчын пасля 40 гадоў ахапіць татальнай дыспансерызацыяй, якая паспрыяе паляпшэнню ўзроўню іх здароўя. Аднак негатыўныя ўплывы традыцыйнай маскуліннасці таксама пачалі выяўляцца. Даследаванні паказалі, што большасць мужчынскага насельніцтва наогул не жадае звяртацца да лекара і, увогуле, не турбуецца аб уласным здароўі. З-за гэтага важна ствараць спецыяльныя ўмовы, якія спрыяюць дыспансерызацыі мужчын. Як выйсце са становішча была прапанавана абавязковая дыспансерызацыя на працоўных месцах. Акрамя таго, прапаноўваліся і іншыя практыка-арыентаваныя меры па павышэнні якасці мужчынскага жыцця. У прыватнасці, Б. Ц. Урланіс прапаноўваў ствараць кансультацыйныя цэнтры для мужчын накшталт жаночых гінекалагічных кансультацый. Яшчэ ў той час адсутнасць такіх кансультацый разглядалася дадзеным даследчыкам як дыскрымінацыя мужчын. Характэрна, што і на сённяшні дзень у многіх краінах не існуе лекараў выключна для мужчын [22, с. 434].

Устойлівая тэндэнцыя да сегрэгацыі палоў на ранніх этапах развіцця дзяцей адмоўна ўплывае на іх далейшую сацыялізацыю. Фактар культуры самым сур’ёзным чынам вызначае такое становішча. У дзіцячым узросце людзі маюць зносіны пераважна толькі з аднагодкамі свайго полу і дадзеная сітуацыя нікога не турбуе. Але менавіта такі падыход дае аднабокае развіццё дзяцей, выхоўваючы ў іх няправільныя ўяўленні як пра супрацьлеглы, так і пра свой пол. З-за гэтага ўзнікаюць непаразуменні і канфлікты [23, с. 278].

Гендарная палярызацыя не лепшым чынам адбівалася на адэкватным успрыманні жаночага і мужчынскага полу. У першую чаргу адрозненні выкарыстоўваліся для сацыяльнай арганізацыі. Практычна любы сацыяльна-культурны аспект пазіцыянаваўся ў кантэксце гендарных адрозненняў [10, с. 35].

Жорсткае падаўленне эмацыянальных парываў у мужчын, якія ўспрымаюцца нашай культурай практычна як жаноцкія, стварае для многіх з іх сур’ёзныя цяжкасці, узаемазвязаныя з пры-

знаннем у сабе жаданняў, якія не ўпісваюцца ў традыцыйныя ўяўленні аб мужнасці. Глыбіні псіхікі гэтых мужчын змяшчаюць падаўленыя імпульсы падобнага роду, што не вырашае праблемную сітуацыю, а правакуе адчуванне пастаяннай унутранай пагрозы для іх гендарнай ідэнтычнасці [10, с. 210].

З дзяцінства хлопчыкам навязваюцца стэрэатыпныя ўстаноўкі патрыярхальнай мужнасці. У выніку гэтага яны, усведамляючы сваю непазбежную слабасць, саромеюцца гэтага і хаваюць яе, што прыводзіць да страхаў, адзіноты і пачуцця безвыходнасці, якія ў далейшым суправаджаюць і дарослага мужчыну. Адчуваючы немагчымасць адпаведнасці ідэалам патрыярхальнага грамадства, і хлопчыкі, і мужчыны імкнуцца схаваць свае слабасці і няўдачы. Але гэта не ўся праблема. Свой сорам яны таксама вымушаны хаваць [7, с. 2].

Як правіла, на адны і тыя ж учынкі хлопчыкаў і дзяўчынак многія бацькі рэагуюць па-рознаму. Калі паводзіны хлопчыка звязаны з фізічнай актыўнасцю, то дзяўчынак часта папракаюць у гэтым, абгрунтоўваючы крытыку менавіта гендарнымі асаблівасцямі. Аналагічныя паводзіны хлопчыкаў часцей за ўсё не выклікаюць крытычнай рэакцыі з боку бацькоў. Больш за тое, бацькі часта самі падштурхоўваюць дзяцей мужчынскага полу да больш актыўных дзеянняў у працэсе гульні і вольнага часу, нават насуперак іх волі.

Падыход, у якім хлопчык і мужчына ўспрымаюцца ў класічным патрыярхальна-маскулінным катэксце, супярэчыць і назіранням вучоных-медыкаў. Так, навукоўцы ўсталявалі, што з моманту нараджэння і на працягу першых месяцаў жыцця немаўляты-хлопчыкі выказваюць эмоцыі нават больш адкрыта, чым дзяўчынкі, якім у патрыярхальных грамадствах стэрэатыпна прыпісваюць большую эмацыянальнасць. З часам эмацыянальнасць у хлопчыкаў істотна зніжаецца, што не прыносіць ні ім, ні дарослым нічога добрага. Гэта адбываецца ў выніку дзвюх прычын, якія непасрэдна звязаны з гендарнай стэрэатыпізацыяй і падвойнымі стандартамі. Першая прычына заключаецца ў выкарыстанні сораму для духоўнага выхавання хлопчыка. Хлопчыкаў першапачаткова вучаць саромецца за ўсё, што звязана са слабасцю і ўразлівасцю. Другая – паскоранае аддзяленне хлопчыка ад маці ў духоўным плане. Неабходна пазбягаць супрацьпастаўлення мужчынскага і жаночага не толькі ў працэсе гендарнага выхавання дзяцей, а таксама і ў цэлым у грамадстве, бо менавіта на ранніх этапах станаўлення асобы такі падыход аказвае найбольш неспрыяльны ўплыў і негатыўна фарміруе ўсе далейшыя адносіны гендарнага характару [7, с. 6].

**Высновы.** На прыкладзе падвойных стандартаў у працэсе выхавання назіраецца неаб’ектыўнасць шэрага ўяўленняў аб належным для мужчынскага і жаночага. У такіх сітуацыях хлопчыкі часта альбо хаваюць свае пачуцці за маскай бравады, альбо становяцца ціхімі і закамплексаванымі. Стэрэатып, які сведчыць пра тое, што мужчына толькі сам павінен вырашаць свае праблемы, прымушае іх аддаляцца ад блізкіх людзей [7, с. 3].

У сучасным свеце на матэрыяльна-тэхнічным узроўні няма ніякіх перашкод для пераадолення жорсткіх установак патрыярхальнай сістэмы. Тым не менш фактычнай гендарнай роўнасці дамагчыся не ўдалося практычна нідзе. Гэта тлумачыцца як актыўным супраціўленнем радыкальнага патрыярхату, так і лабіраваннем палітыкі пазітыўнай дыскрымінацыі і іншых экстрэмальных методык ажыццяўлення сацыяльнай рэгуляцыі з боку радыкальнага фемінізму. Сучасная мужчынская гендарная роля знаходзіцца ў сур’ёзным крызісным стане практычна ва ўсіх грамадствах. Можна адзначыць, што на сённяшні дзень сфарміравалася аб’ектыўная неабходнасць у рэканструкцыі мужнасці на базе прынцыпаў гендарнай роўнасці і агульначалавечых каштоўнасцей.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Ильиных, С. А. Шесть горизонтов пола: социологическая рефлексия маскулинности и фемининности [Электронный ресурс] / С. А. Ильиных // Концепт : науч.-метод. электрон. журн. – 2013. – Т. 3. – С. 106–110. – Режим доступа: https://e-koncept.ru/2013/53023.htm. – Дата доступа: 20.02.2018.

2. Зальцман, М. Новый мужчина: маркетинг глазами женщин / М. Зальцман, А. Матария, Э. О’Райли ; пер. с англ. [А. Стативки]. – СПб. : Питер, 2008. – 352 с.

3. Кант, И. Сочинения : в 6 т. / И. Кант. – М. : Мысль, 1964. – Т. 2. – 611 с.

4. Стяжкина, Е. В. Маскулинность как историческая проблема / Е. В. Стяжкина // Диалог со временем. – 2010. – № 31. – С. 338–372.

5. Разводовский, Ю. Е. Алкоголь и суициды в России, Украине и Беларуси: сравнительный анализ трендов / Ю. Е. Разводовский // Суицидология. – 2016. – Т. 7, № 1 (22). – С. 3–10.

6. Насилие и его влияние на здоровье: доклад о ситуации в мире : пер. с англ. / под ред. Э. Г. Круга [и др.]. – М. : Весь мир, 2003. – 349 с.

7. Поллак, У. Настоящие мальчики: как спасти наших сыновей от мифов о мальчишестве / У. Поллак ; [пер. с англ. Е. Жолниной]. – М. : Ресурс, 2013. – 508 с.

8. Смелзер, Н. Социология : пер. с англ. / Н. Смелзер. – М. : Феникс, 1994. – 687 с.

9. Киммел, М. Гендерное общество / М. Киммел ; [пер. с англ. О. А. Оберемко, И. Н. Тартаковской]. – М. : РОССПЭН, 2006. – 460 с.

10. Бем, С. Линзы гендера. Трансформация взглядов на проблему неравенства полов / С. Бем ; [пер. с англ. Д. Викторовой]. – М. : РОССПЭН, 2004. – 332 с.

11. Кон, И. С. Мужское тело в истории культуры / И. С. Кон. – М. : Слово, 2003. – 431 с.

12. Когут, Е. В. Правовое положение женщины в палеологовской Византии / Е. В. Когут // Знание. Понимание. Умение. – 2012. – № 3. – С. 339–342.

13. Робинсон, П. Невольники чести: мужественность на поле боя в начале XX века / П. Робинсон // О муже(N) ственности : сб. ст. / сост. С. Ушакин. – М., 2002. – С. 186–198.

14. Руссо, Ж.-Ж. Педагогические сочинения : в 2 т. / Ж.-Ж. Руссо ; под ред. Г. Н. Джибладзе. – М. : Педагогика, 1981. – Т. 1. – 653 с.

17. Бадентэр, Э. Мужская сущность / Э. Бадентэр ; пер. с фр. И. Крупичева, Е. Шевченко. – М. : Новости, 1995. – 302 с.

18. Ликвидировать разрыв в течении жизни одного поколения: ВОЗ комиссия по социальным детерминантам здоровья от 2008 г. : заключ. докл. / пер. Л. Головина, С. Евтушенко. – Казань : Весь мир, 2008. – 246 с.

19. Ильин, Е. П. Пол и гендер / Е. П. Ильин. – СПб. [и др.] : Питер, 2009. – 686 с.

20. INSPIRE: семь стратегий по ликвидации насилия в отношении детей [Электронный ресурс] / Всемир. орг. здравоохранения. – Женева : Всемир. орг. здравоохранения, 2017. – Режим доступа: https://apps.who.int/iris/bitstream/handle/10665/207717/9789244565353-rus.pdf?sequence=7. – Дата доступа: 15.03.2018.

21. Берн, Ш. Гендерная психология: законы мужского и женского поведения / Ш. Берн ; [пер.: С. Рысев и др.]. – СПб. : Прайм-Еврознак, 2007. – 318 с.

22. Здравомыслова, Е. Кризис маскулинности в позднесоветском дискурсе / Е. Здравомыслова, А. Тёмкина // О муже(N)ственности : сб. ст. / сост. С. Ушакин. – М., 2002. – С. 432–451.

23. Бендас, Т. В. Гендерная психология : учеб. пособие / Т. В. Бендас. – СПб. [и др.] : Питер, 2006. – 430 с.

## References

1. Il'inykh S. A. Six horizons of sex: sociological reflection of masculinity and femininity. *Kontsept* [Concept], 2013, vol. 3, pp. 106–110. Availabe at: https://e-koncept.ru/2013/53023.htm (accessed 20.02.2018) (in Russian).

2. Salzman M., Matathia I., O'Reilly A. *The future of men*. New York, Palgrave Macmillam, 2006. 242 p. (Russ. ed.: Zal'tsman M., Matatiya A., O'Raili E. Novyi muzhchina: marketing glazami zhenshchin. St. Petersburg, Piter Publ., 2008. 352 p.)

3. Kant I. *Works. Vol. 2*. Moscow, Mysl' Publ., 1964. 611 p. (in Russian).

4. Styazhkina E. V. Masculinity as a historical problem. *Dialog so vremenem = Dialogue with Time*, 2010, no. 31, pp. 338–372 (in Russian).

5. Razvodovskii Yu. E. Alcohol and suicides in Russia, Ukraine and Belarus: a comparative analysis of trends. *Suitsidologiya = Suicidology*, 2016, vol. 7, no. 1 (22), pp. 3–10 (in Russian).

6. Krug E. G., Dahlberg L. L., Mercy J. A., Zwi A. B., Lozano R. (eds). *World report on violence and health*. Geneva, World Health Organization, 2002. 346 p. (Russ. ed.: Krug E. G. (et al.). *Nasilie i ego vliyanie na zdorov'e: doklad o situatsii v mire*. Moscow, Ves' mir Publ., 2003. 349 p.)

7. Pollack W. *Real boys: rescuing our sons from the myths of boyhood*. New York, Henry Holt & Co., 1999. 447 p. (Russ. ed.: Pollak U. *Nastoyashchie mal'chiki: kak spasti nashikh synovei ot mifov o mal'chishestve*. Moscow, Resurs Publ., 2013. 508 p.)

8. Smelser N. *Sociology*. New Jersey, Prentice Hall, 1988. 449 p. (Russ. ed.: Smelzer N. *Sotsiologiya*. Moscow, Feniks Publ., 1994. 687 p.)

9. Kimmel M. *The Gendered society*. New York, Oxford University Press, 2000. 315 p. (Russ. ed.: Kimmel M. *Gendernoe obshchestvo*. Moscow, ROSSPEN Publ., 2006. 460 p.)

10. Bem S. *The lenses of gender. Transforming the debate on sexual inequality*. New Haven, Yale University Press, 1993. 256 p. (Russ. ed.: Bem S. *Linzy gendera. Transformatsiya vzglyadov na problemu neravenstva polov*. Moscow, ROSSPEN Publ., 2004. 332 p.)

11. Kon I. S. *Male body in the history of culture*. Moscow, Slovo Publ., 2003. 431 p. (in Russian).

12. Kogut E. V. Legal status of women in Byzantium. *Znanie. Ponimanie. Umenie = Knowledge. Understanding. Skill*, 2012, no. 3, pp. 339–342 ( in Russian).

13. Robinson P. Slaves of Honor: Masculinity on the Battlefield at the Beginning of the 20th Century. *O muzhe(N) stvennosti: sbornik statej* [About masculinity: collection of articles]. Moscow, 2002, pp. 186-198 (in Russian).

14. Russo Zh.-Zh. *Pedagogical works. Vol. 1.* Moscow, Pedagogika Publ., 1981. 653 p. (in Russian).

15. Jurchak A. Men's economy: «Not to the point of nonsense when you do a career». *O muzhe(N)stvennosti: sbornik statej* [About masculinity: collection of articles]. Moscow, 2002, pp. 245–267 (in Russian).

16. Goncharov Ju. «The master of life»: merchants as a type of masculinity. *O muzhe(N)stvennosti: sbornik statej* [About masculinity: collection of articles]. Moscow, 2002, pp. 397–413 (in Russian).

17. Badenter E. *Man's essence*. Moscow, Novosti Publ., 1995. 302 p. (in Russian).

18. *Closing the gap in a generation. Health equity through action on the social determinants of health: Commission on Social Determinants of Health: final report*. Geneva, World Health Organization, 2008. 248 p. (Russ. ed.: *Likvidirovat' razryv v techenii zhizni odnogo pokoleniya: VOZ komissiya po sotsial'nym determinantam zdorov'ya ot 2008 g.: zakljuchitel'nyj doklad*. Kazan, Ves' mir Publ., 2008. 246 p.)

19. Il'in E. P. *Sex and gender*. St. Petersburg etc., Piter Publ., 2009. 686 p. (in Russian).

20. *INSPIRE: seven strategies for ending violence against children*. Geneva, World Healt Organization, 2016. Available at: https://www.who.int/violence_injury_prevention/violence/inspire/en/ (accessed 15.03.2018).

21. Burn S. M. *The social psychology of gender*. New York, McGraw-Hill, 1996. 233 p. (Russ. ed.: Bern Sh. *Gendernaja psihologija: zakony muzhskogo i zhenskogo povedenija*. St. Petersburg, Prajm-Evroznak Publ., 2007. 318 p.)

22. Zdravomyslova E., Temkina A. The crisis of masculinity in the late Soviet discourse. *O muzhe(N)stvennosti: sbornik statej* [About masculinity: collection of articles]. Moscow, 2002, pp. 432–451 (in Russian).

23. Bendas T. V. *Gender psychology*. St. Petersburg etc., Piter Publ., 2006. 430 p. (in Russian).

## Информация об авторе

**Столяров Дмитрий Владимирович** – магистр социологических наук, младший научный сотрудник. Институт философии, Национальная академия наук Беларуси (ул. Сурганова, 1, корп. 2, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: nizshe@mail.ru.

## Information about the author

**Dzmitry U. Staliarou** – MA (Sociol.), Junior Scientific Researcher. Institute of Philosophy of the National Academy of Sciences of Belarus (1 Surganov Str., Bldg. 2, Minsk 220072, Belarus). E-mail: nizshe@mail.ru.